**Новік В.М.**, *ст. выкладчык*

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ЭЛЕМЕНТАЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ШМАТГАЛОССЯ Ў ХАРАВЫХ АПРАЦОЎКАХ 20-х ГАДОЎ

У 20-я гады найбольш адметным і плённым было развіццё жанру беларускай народнай песні, што абумоўлівалася агульным нацыянальна-культурным уздымам і так званым «харавым рухам». Разам з рускімі, польскімі, літоўскімі кампазітарамі актыўна займаліся харавой апрацоўкай нацыянальныя музыканты і хормайстры: А.Грыневіч, У.Тэраўскі, М.Равенскі, К.Галкоўскі і інш.

У найбольш сканцэнтраваным выглядзе гэты жанр, як і вынікі самой працы над харавой апрацоўкай, выявіўся ў друкаваных нотных зборніках. Адным з першых, хто выкарыстоўваў элемент народнага шматгалосся ў сваіх гарманізацыях, быў вядомы фалькларыст А.Грыневіч. Так, ужо ў фальклорным зборніку «Беларускія песні з нотамі», II ч. (СПб., 1912) пры запісе песні «Як я малада ў матульні была» (N 12)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сустракаюцца элементы тэрцавай уторы, што падкрэслівае асаблівасці выканальніцкай шматгалосай традыцыі падчас запісу фальклярыстам народных мелодый. Гэта знайшло адлюстраванне ў двух зборніках - «Народным спеўніку» і «Школьным спеўніку» выдання 1920 г. з трохгалосымі гарманізацыямі для аднародных галасоў, якія ўтрымліваюць элементы кантавай фактуры, бурдону, двухгалосыя запевы з тэрцавай уторай і перадачай мелодыі з голасу ў голас («У нашага купчыка», «Добры вечар, дзяўчына», «А ў бары, бары», «Козлік», «Саўка ды Грышка»). У некаторых гарманізацыях А.Грыневіч выкарыстоўваў у харавым гучанні інструментальныя прыёмы. Гэта спяванне з закрытым ротам, арганны пункт, рух галасоў паралельнымі секстамі («То-то-то», «Перапёлка», «Перад Пятром»). У лірычнай песні «Рабіна, рабіначка» ён даручае сярэдняму, больш рухомаму, голасу весці варыянт падгалоска да асноўнай мелодыі.

Другі вядомы і папулярны хормайстар 20-х гадоў У.Тэраўскі ў сваіх зборніках гарманізацый, «Беларускім спеўніку з нотамі на тры галасы» (Мн., 1921) і «Беларускім лірніку для 3-4 галасоў мяшанага хору» (Берлін, 1922), выкарыстоўваў такія народныя прыёмы, як 2-галосыя запевы, непастаянную колькасць галасоў пры аднародным складзе, дубліраванне жаночых галасоў мужчынскімі, элементы імітацыйнай поліфаніі («А на гары цэркаўка»), падваенне галасоў з тэрцавай уторай у верхніх ці ніжніх галасах у спалучэнні з арганным пунктам («Троіцкая»). У некаторых сваіх гарманізацыях У.Тэраўскі абапіраецца на традыцыі мужчынскіх харавых спеваў, што праяўляецца ў 3-галосым кантавым складзе, унісонных запевах і хара-вых падхопах, паходным тэмпе (N 12, 14, 16, 21, 24 з «Беларускага спеўніка»). Г.І.Цітовіч змясціў у «Анталогіі беларускіх народных песень» 20 песень у запісах У.Тэраўскага.

Беларускі кампазітар Мікола Равенскі выкарыстоўваў элементы народных выканальніцкіх прыёмаў ужо ў сваім першым зборніку 1922 г.(«Зборнік песень з нотамі»). Так, у мяшаным хоры на сл. М.Багдановіча «Не кувай ты, шэрая зязюля» працяглы бурдон у актаву на ноце соль дапамагае раскрыццю настрою верша.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрцавая ўтора, даўганоты, ферматы, мелізматыка, нерухомыя арганныя пункты, што перадаюцца з голасу ў голас, рэалістычна падкрэсліваюць выканальніцкую манеру жніўнай працоўнай песні «Ой, ды бокам хмарачка». У гэтым хоры кампазітар ужывае такі элемент прыёму народнага шматгалосся, як імітацыя ва унісон на бурдоннай аснове (у тэрцавым выглядзе). У іншых апрацоўках гэтыя элементы гетэрафоніі ў запеве («А хто ў полі»), харавы падхоп і падваенне галасоў у тэрцыю («Раёк»).

Калектыўны зборнік з гарманізацыямі Я.Прохарава «Беларускія народныя песні сольныя і харавыя з акампанементам фартэпіяна» (вып.1. Мн., 1928) працягвае традыцыі апрацовак народных песень, закладзеныя М.Балакіравым, М.Рымскім-Корсакавым, А.Лядавым.

Некаторыя народныя выканальніцкія прыёмы ў выглядзе элементаў варыяцыйнасці знайшлі сваё найбольш яркае ўвасабленне ў гарманізацыях a cappella Я.Прохарава («Прыляцела галка», «Завілася пчолка над варатмі»). У кампазітара А.Аленіна важную ролю адыгрывае суправаджэнне, якое дапаўняе аднародны шматгалосы хор падгалоскамі ці мяшанай харавой фактурай («Радзі, сонца, жыта», «Гэй, вясна»), а ў некаторых больш разгорнутых гарманізацыях абрамляе харавое шматгалоссе арганным гучаннем ці кантрапунктам, што надае суправаджэнню ролю запеву, за якім ідзе харавы падхоп. Кампазітар выкарыстоўвае розныя элементы народнага шмтгалосся. Гэта «гуртавы» спеў («Ай, вечар, вечар»), кантавая традыцыя («Як пайшоў Мікола») гетэрафонна-унісонная («Наша бабка падпіла», «Асовае карыта»). Для дзвюх гарманізацый М.Іпалітава-Іванава характэрна квінтавае асцінато ў басу суправаджэння ла тоніцы, імітуючая найгрыш; верхні голас падтрымлівае аднагалосую мелодыю, а сярэдні дапаўняе яе падгалоскамі.